## V Майскія Віткаўскія чытанні
## “Я слова запаветнага шукаў”

Яны доўжыліся з 16 па 23 мая 2012 года, выдаліся на Год кнігі, які быў аб’яўлены ў нашай краіне. Гэта падзея дала штуршок для пошуку новых формаў правядзення традыцыйнага форуму. Чытанні вырашана было правесці пад эгідай Рэспубліканскай акцыі “Чытаем разам – чытаем па-беларуску”, эстафету якой нам перадала ДУ “Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска”.




*Рэспубліканскую акцыю чытачы чакалі даўно*

Шэраг мерапрыемстваў віткаўскай тэматыкі для розных катэгорый карыстальнікаў стаў адметнай з’явай у культурным жыцці раёна. Акцыя ўключала штодзённыя гучныя чытанні твораў Васіля Віткі для дашкольнікаў і вучняў малодшага школьнага ўзросту, радыёгутаркі, экскурсіі-знаёмствы з выставамі і адкрытымі праглядамі літаратуры, лялечныя спектаклі.

Урокі роднага слова “Слова – трапяткое і вобразнае” прайшлі ў дзіцячым аддзеле з ўдзелам творчых дзіцячых калектываў горада. Выніковым мерапрыемствам X этапа акцыі “Чытаем разам – чытаем па-беларуску” на Случчыне стаў літаратурны фестываль “Святло беларускай кнігі”. Урачыстае адкрыццё фестывалю адбылося ў раённай цэнтральнай бібліятэцы, дзе з юнымі чытачамі і дарослымі аматарамі віткаўскага слова сустрэліся беларускія пісьменнікі, журналісты, мастакі. Слуцк ахапіла хваля творчасці, беларускай мовы і чытання. Не засталіся па-за ўвагай жыхароў хвалюючая сустрэча “Пад



*Урокі роднага слова ад Васі Вясёлкіна*

каляровымі промнямі “Вясёлкі” з галоўным рэдактарам часопіса Уладзімірам Ліпскім, яго намеснікам Анастасіяй Радзікевіч, літаратурным рэдактарам Алесем Бараноўскім. Шмат прыемных хвілін даставіла чытачам літаратурная вандроўка “Казачная краіна Алены Масла”, кніжны марафон “Чароўныя ідэі Наталлі Бучынскай”, літаратурны кактэйль са Святланай Дзянісавай “Адвечная маладосць творчасці”, пленэр з мастаком часопіса Уладзімірам Жуком “Малюем “Вясёлку”. Сустрэча ў літаратурнай гасцёўні з Міколам Чарняўскім захапіла маленькіх чытачоў яскравым каларытам вершаў. Завяршальным акордам фестывальных мерапрыемстваў стала святочная імпрэза "Нам засталася Спадчына" ў гарадскім Палацы культуры. Сталічныя літаратары адзначылі падзякамі і падарункамі самых актыўных чытальнікаў твораў і прапагандыстаў віткаўскага слова.



*Паэта М. Чарняўскага чытачы слухаюць з задавальненнем*

Чытанні далі падставу для ўсведамлення каштоўнасці творчай спадчыны Васіля Віткі і неабходнасці захавання яе для будучых пакаленняў.

Ва ўрачыстай абстаноўцы каля Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі адбылося святочнае адкрыццё літаратурнага фестывалю. Дырэктар раённай цэнтральнай бібліятэкі і яе філіялаў Людміла Гурыновіч адзначыла: «Гонар прымаць на Случчыне такі фестываль. Давайце разам яшчэ раз перагорнем старонкі цудоўных беларускіх кніг...». Яна прадаставіла слова галоўнаму рэдактару часопіса «Вясёлка», лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэату літаратурных прэмій імя



*Урачыстае адкрыццё літаратурнага фестывалю*

ЯнкіМаўра і Васіля Віткі, старшыні праўлення Дзіцячага фонду Беларусі Уладзіміру Ліпскаму. Адкрываючы цырымонію, пісьменнік сказаў: «Мы павінны несці ў сваю душу святло кнігі. Няхай гэты сонечны майскі дзень увойдзе ў наша жыццё як свята – свята нашай душы, свята кнігі».

Случчына вітала ўдзельнікаў літаратурнага фестывалю «Святло беларускай кнігі» (у рамках 10-й рэспубліканскай акцыі «Чытаем разам! Чытаем па-беларуску!»). літаратурным марафонам з удзелам беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, літаратуразнаўцаў «Пад небам беларускага слова», у ходзе якога прайшла прэзентацыя кнігі Уладзіміра Ліпскага «Янкаў вянок».

У ходзе мерапрыемства дзеці чыталі вершы, а пісьменнік падарыў кожнаму «зробленыя» часопісам «грошы» «вясёлікі». Пад «каляровымі промнямі» «Вясёлкі» адбылася і сустрэча з галоўным мастаком часопіса Уладзімірам Жуком, які паведаміў пра тое, як давялося збіраць фотаілюстрацыі для часопіса.

Тым часам на другім паверсе бібліятэкі пра паэзію і вершы расказваў Мікола Чарняўскі. Юныя случчане з захапленнем слухалі яго, адказвалі на пытанні паэта.



*Літаратурны фестываль ператварыўся ў сапраўднае свята*

Святочнае мерапрыемства працягвалася ў гарадскім Доме культуры, дзе сабраліся аматары беларускай літаратуры, члены рэдакцыйнай калегіі часопіса «Вясёлка». Сярод іх была і Алена Масла – аўтар казак для дзяцей, Тамара Патук – загадчыца дзіцячай бібліятэкі-філіяла №6 імя Васіля Віткі города Мінска, Святлана Дзянісава – галоўны рэдактар часопіса «Маладосць». Начальнік аддзела культуры Слуцкага райвыканкама Алена Камоцкая ад імя старшыні Слуцкага райвыканкама У.В. Даманеўскага павіншавала ўдзельнікаў урачыстасці са святам. На сцэне гарадскога Дома культуры прыхільнікі беларускага слова чыталі вершы, «гарталі» старонкі кніг. Дзеці з захапленнем чыталі вершы беларускіх аўтараў.



*Кніга – лепшы падарунак ад пісьменніка*

Рэдакцыя часопіса «Вясёлка» заахвоціла самых актыўных чытачоў, уручыла ім падзячныя лісты.

Уладзімір Ліпскі падарыў гарадской дзіцячай бібліятэцы кнігу «Я – сын ваш». «Эстафета» акцыі «Чытаем разам! Чытаем па-беларуску!» перайшла гораду Полацку. Дырэктар Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі і яе філіялаў Людміла Гурыновіч напрыканцы свята адзначыла: «Заўсёды будзем захоўваць нашу спадчыну. Родная мова – першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё».